МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
21 лютага 2024 г. № 7 (740)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

Наталля КАЧАНАВА:

# «У НАС ЦУДОЎНАЯ МОЛАДЗЬ»

## Аб чым Старшыня Савета Рэспублікі гаварыла са студэнтамі БДУ








Фота БелТА.

**ПРЫЯРЫТЭТЫ дзяржаўнай палітыкі і міжнароднае становішча, асаблівасці заканадаўчай дзейнасці і работы верхняй палаты Парламента, электаральная кампанія і роля моладзі ў ёй, інфармацыйная гігіена і адказнасць за будучыню краіны — вось тыя асноўныя тэмы, што абмяркоўваліся на сустрэчы. Акрамя іх, было яшчэ многа абмеркаванняў, цікавых пытанняў і шчырых адказаў на іх.**

Пачалася сустрэча традыцыйна — з расказу Наталлі Качанавай аб тым, чым жыве краіна сёння, якія мэты і задачы наперадзе, што зроблена і што патрабуе ўвагі ў будучым. Аднак была і адна акалічнасць — у аўдыторыі былі выключна студэнты. Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла: «Я папрасіла, каб сёння тут прысутнічалі толькі студэнты, без выкладчыкаў, без рэктара. Я папрасіла прабачэння, канешне, маўляў, разумею, што пажадана, каб былі і кіраўнікі, але... Чаму так? Таму што я проста хачу з вамі пагаварыць. Я зараз давяду да вас інфармацыю, якой хацела б падзяліцца, а потым вы мне задасце любыя пытанні, якія вам будуць цікавымі. Асабістага плану, накont развіцця нашай краіны, канкрэтна маёй працы — усё, што вам цікава».

### «Работа над законапраектамі цікавая, не сухая»

Менавіта так ахарактарызавала Старшыня Савета Рэспублікі заканадаўчую дзейнасць. Яна адзначыла, што Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых саветаў выбіраюцца па восем членаў Савета Рэспублікі, яшчэ восем — прызначаюцца Прэзідэнтам. На сёння ў склад верхняй палаты Парламента ўваходзяць 58 чалавек, якія займаюцца заканатворчай дзейнасцю і не толькі.

У Беларусі каля 2,3 тысячы дзеючых законаў, з іх прыкладна палова — аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў, далучэнні да дакументаў міжнародных арганізацый. Апошнім часам асноўная работа вялася па прывядзенні дзеючага заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Наталля Качанава адзначыла, што план гэтай работы выкананы на 100 %, неабходныя змяненні ўнесены ў 86 законаў, а таксама былі прыняты два абсалютна новыя: «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці».

Спікер падкрэсліла, што работа гэтая надзвычай сур'ёзная, часта патрабуе далучэння вузкіх спецыялістаў. Каб усе заканадаўчыя акты і нарматыўныя прававыя акты былі дакладнымі і выверанымі, у Савеце Рэспублікі дзейнічае экспертны савет. За час яго работы разгледжана 252 дакументы, з якіх без заўваг было падтрымана толькі каля 30 %, што сведчыць аб дасканалай і скрупулёзнай рабоце спецыялістаў савета.

Звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі і на важнасць работы з людзьмі. «Гэта важная і значная частка нашай дзейнасці. Дзякуючы сустрэчам з моладдзю, з працоўнымі калектывамі, асабістым прыёмам і тэлефонным лініям мы бачым і чуем, што хвалюе людзей, на што трэба звярнуць увагу ў першую чаргу. Такім чынам удакладняюцца і карэкціруюцца планы нашай работы», — адзначыла яна. Акрамя таго, карысць такіх сустрэч яшчэ і ў тым, што людзі непасрэдна ад дзеючых палітыкаў атрымліваюць вычарпальную інфармацыю аб дзейнасці органаў улады, прыярытэтах развіцця краіны. І, што немалаважна, інфармацыю дакладную, аб'ектыўную і праўдзівую. У адносінах жа да фэйкаў аб нашай краіне, якія распаўсюджваюцца ў сецiве, Наталля Качанава зазначыла, што не трэба бяздумна паглынаць інфармацыю, тым больш з сумнеўных сайтаў ці тэлеграм-каналаў: «...Адкрытая хлусня ў адносінах да людзей, краіны, падзей — вядома, гэта бяда. І вам у такім патоку інфармацыі, канешне, трэба для сябе дакладна разумець: што правільна, дзе прыярытэты расставіць у гэтым жыцці, што трэба зрабіць сёння, каб заўтра жыць у міры і спакоі».

### Лёсавызначальны этап у жыцці краіны

«Мы ўвайшлі ў палітычна важны этап у жыцці нашай краіны — ідзе электаральная кампанія... І ўсе, хто мае права браць удзел у выбарчай кампаніі, будуць аддаваць свой голас за дэпутата... І вы, каму споўнілася 18 гадоў, пойдзеце на ўчасткі і будзеце галасаваць», — звярнулася да моладзі Старшыня Савета Рэспублікі. На выбарах, у Адзіны дзень галасавання выбаршчыкам трэба будзе выбраць 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 12 514 — мясцовых Саветаў. Потым будуць абраны члены Савета Рэспублікі, а затым сфарміраваны склад Усебеларускага народнага сходу, які ўжо стаў канстытуцыйным органам. Наступны год будзе адметны прэзідэнцкімі выбарамі. Зразумела, што перыяд сапраўды лёсавызначальны і ігнараваць гэтыя падзеі, па сутнасці, тое ж самае, што ігнараваць будучыню сваёй краіны.

Асобна Наталля Качанава адзначыла ролю ў жыцці краіны УНС. Яго члены, агульная колькасць якіх складзе 1200 дэлегатаў, будуць працаваць на працягу пяці гадоў, як і дэпутаты. Усебеларускі народны сход атрымаў надзвычай вялікія паўнамоцтвы, менавіта ён будзе вызначаць стратэгію развіцця дзяржавы і прымаць значныя праграмныя дакументы: Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Бачыць комплексна, на перспектыву

## Наталля Качанава правяла сустрэчу з рэктарамі

**УСТАНОВЫ вышэйшай адукацыі павінны выбудоўваць траекторыю свайго развіцця з улікам кадравай патрэбы ў краіне. Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля Качанава на сустрэчы з рэктарамі сталічных устаноў вышэйшай адукацыі.**

Спікер нагадала, што на сустрэчы з членамі Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка абазначыў задачы, якія стаяць перад установамі вышэйшай адукацыі краіны. Тэрмін для вырашэння ўсіх выяўленых у вышэйшай адукацыі праблем устаноўлены 1 верасня 2024 года. Наталля Качанава прапанавала старшыні Рэспубліканскага савета рэктараў Вадзіму Богушу прадставіць наяўныя прапановы і напрацоўкі, каб улічваць іх у далейшай рабоце, у тым ліку пры разглядзе нарматыўных прававых актаў. Па словах спікера, гэта дазволіць прымаць правільныя, абсалютна абгрунтаваныя, выверaныя рашэнні.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што яшчэ на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі ў ліпені 2023 года з яе ўдзелам ВНУ былі арыентаваны на развіццё з улікам будучых патрэб. Наталля Качанава падкрэслівала, што кіраўнікі павінны дакладна ўяўляць перспектывы кожнай установы вышэйшай адукацыі ў краіне. Паводле яе слоў, важна разумець, наколькі тыя спецыялісты і спецыяльнасці, па якіх вучацца студэнты ў ВНУ, будуць запатрабаваны праз пяць, дзесяць гадоў. І гэта трэба ўлічваць пры ўдасканаленні сістэмы адукацыі — гэта работа праводзіцца ўвесь час.

Гаворачы аб перспектывах, Наталля Качанава адзначыла: «Заўтра іншыя рэаліі, іншыя патрэбы рэальнага сектара эканомікі, гуманітарнай сферы. Мы павінны дакладна гэта разумець». Спікер прапанавала комплекса падумаць над тым, якім будзе развіццё ўстаноў вышэйшай адукацыі, «што сапраўды трэба, што будзе актуальна, запатрабавана». У сувязі з гэтым Старшыня Савета Рэспублікі нагадала аб выязным пасяджэнні экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на базе Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, якое прайшло 15 снежня 2023 года, адзначыўшы, што гэта ўстанова была выбрана невыпадкова. На савеце абмяркоўваліся перспектывы развіцця лёгкай прамысловасці ў Беларусі — гэта галіна ў ліку перспектыўных, якія неабходна развіваць.

«Сёння нашы тавары карыстаюцца попытам у іншых краінах. Але нам патрэбны спецыялісты», — заўважыла спікер. Наталля Качанава нагадала, што Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт некалі быў адзінай ВНУ ў краіне, якая рыхтавала дызайнераў, мадэльераў, спецыялістаў для гарбарнай галіны, абутковай прамысловасці. Гэтая навучальная ўстанова і сёння мае няўрэнную навучальную базу, кваліфікаваныя кадры. Аднак колькасці маладых людзей, якія туды паступаюць, недастаткова для забеспячэння цяперашняй патрэбы эканомікі. «Нам сёння трэба нашмат больш такіх спецыялістаў», — адзначыла яна.

**Паводле БелТА.**